мовай як сродкам камунікацыі. Але такая праблема павінна вырашацца і на іншых прадметах (у адпаведнасці са спецыялізацыяй).

## ЛІТАРАТУРА


1. Безенкова, Т. А. Опыт развития культуры речи студентов вуза в процессе изучения дисциплин культурологического цикла [электронны рэсурс]: http://www.emissia.org/offline/2007/1187.htm
2. Камуз, В. В. Развитие культуры речи студентов в профессиональной подготовки (на примере сельскохозяйственного вуза) // «Педагогика и психология», «Филология и искусствоведение» №1 [электронны рэсурс]: http://www.ssc.smr.ru/media/journals/izvestia/2008/2008_6_1_41_45.pdf
3. Преликова, О. С. Проблема профессиональной речевой подготовки студентов высших школ [электронны рэсурс]: http://www.ibl.ru/konf/061207/73.html


УДК 631.115 (476.6)

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ТАВАРЫСТВЫ І ІХ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ НА ПАЧАТКУ XX СТ.

**Радзюк А. Р., Галубовіч В. У.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На тэрыторыі Гарадзенскай губерні на пач XX ст. дзейнічала некалькі сельскагаспадарчых таварыстваў, якія вылучаліся як сваёй спецыялізацыяй, так і рэгіянальнымі адметнасцямі. Найстарэйшым з іх было Гарадзенскае сельскагаспадарчае таварыства, якое паўстала ў 1900 г. Паколькі яго дзейнасць на сённяшні дзень найбольш даследавана [1, s. 302-317; 3, с. 76], то мы спыняць сваю ўвагу на ім у межах дадзенага артыкула амаль не будзем.

Акрамя агульнага губернскага таварыства, на тэрыторыі губерні функцыянаваў шэраг тэрытарыяльных аграрных суполак. Пры гэтым сярод апошніх таксама назіралася пэўная градацыя: па сваім складзе яны дзяліліся на сялянскія (аб'ядноўвалі гаспадароў адной воласці) і абшарніцкія (у межах пэўнага павета). Да ліку апошніх адносіліся Брэсцкае (утворана ў 1909), Ваўкавыскае (1906 г.), Слонімскае (1908 г.). Па многіх накірунках дзейнасці яны апярэджвалі Гродзенскае таварыства, якое ў 1906-1908 гг. перажывала відавочны крызіс. Таксама перад пачаткам Першай сусветнай вайны ў губерні існавалі Верцялішскае, Астрамечаўскае, Друсгеніцкае, Кузніцкае, Парэцкае і, магчыма, іншыя сельскагаспадарчыя таварыствы [6, арк. 1, 27]. Сярод іх найбольшай актыўнасцю вылучалася Верцялішскае. Вядома, што яно паўстала ў 1911 г. з ініцыятывы начальніка Дэпартамента земляробства



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

і дзяржаўнай маёмасці Ф. Прохарава. На пачатак 1914 г. суполка мела ўласную сельскагаспадарчую бібліятэку, склад сельскагаспадарчых прылад працы і налічвала 66 асоб (17 інтэлігентаў і 49 сялян) [7, арк. 23, 27]. Узначальваў яе мясцовы святара Леў Тэадаровіч.

Правобразы будучых асобных спецыялізаваных аграрных аб'яднанняў паўсталі яшчэ падчас стварэння і першых крокаў Гродзенскага сельскагаспадарчага таварыства. Тады ў яго структуры былі вылучаныя аграрнае, вінакурнае, крухмальнае, жывёлагадоўчае і іншыя асобныя аддзяленні (кабінеты). Але ў сувязі з пасіўнасцю іх сяброў, яны фактычна ніяк сябе не праявілі. Таму не дзіва, што ў хуткім часе паўсталі губернскія структуры, якія ставілі перад сабой мэты развіцця і ўдасканалення той ці іншай аграрнай галіны. Так, у 1901 г. было ўтворана Гарадзенскае таварыства садаводаў [4, с. 325-328]. Пазней узнік Саюз жывёлаводаў пры Гарадзенскім сельскагаспадарчым таварыстве, які меў 11 рэгіянальных гурткоў [7, арк. 6].

Усе азначаныя таварыствы, незалежна ад іх спецыялізацыі ці тэрытарыяльнай прыналежнасці, ставілі перад сабой аднолькавыя мэты: развіццё і папулярызацыя перадавых метадаў вядзення гаспадарання. Але ў сілу шэрага прычын па-рознаму рэалізоўвалі іх на практыцы. Дэталёвы аналіз працы ўсіх добраахвотных аграрных суполак дазваляе нам вылучыць наступныя асноўныя віды іх дзейнасці:

- лабіраванне ініцыятывы і збор грошай на адкрыццё сельскагаспадарчых пачатковых навучальных устаноў (было некалькі падобных ініцыятыў) [2, с. 267-269; 8, с. 299-302];
- правядзенне кароткачасовых сельскагаспадарчых курсаў, чытанняў, выстаў і г. д.;
- стварэнне вопытных палей, якія існавалі пры Ваўкавыскім, Брэсцкім і Гарадзенскім сельскагаспадарчых таварыствах. У апошнім, напрыклад, вопытнае поле было заснавана ў 1909 г. пры маёнтку Цагельна. Дзеля паспяховага яго функцыянавання там быў пабудаваны дом наглядчыка і кватэры работнікаў, розныя гаспадарчыя пабудовы [5, арк. 173]. У 1914 г. на чале таварыства быў выпускнік Кракаўскага ўніверсітэта Казімір Урублеўскі [7, арк. 12]. Таксама да ліку падобных відаў дзейнасці трэба аднесці стварэнне садовага гадавальніка на Грандзіцкай вуліцы ў Гародні, што належаў мясцоваму таварыству Садаводства;
- адкрыццё злучных пунктаў з мэтай паляпшэння пароды мясцовай худобы;
- утварэнне крэдытных кас і кас узаемадапамогі;
- адкрыццё складаў з найноўшай тэхнікай, пракатных пунктаў, а таксама забеспячэнне насеннем, тукавымі ўгнаеннямі і г.д.;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

- арганізацыя экскурсій у перадавыя гаспадаркі з мэтай пераймання найноўшага вопыту (гэтым займаліся ў першую чаргу сялянскія таварыствы);
- запрашэнне спецыялістаў (у тым ліку і з іншых губерняў) для чытання рэфератаў і правядзення практычных заняткаў па розных тэмах;
- правядзенне анкетавання аб стане той ці іншай аграномічнай сферы, збор статыстычных звестак і інш.

Інтэнсіфікацыя работы розных таварыстваў аграрнай скіраванасці, а таксама ініцыятыва з боку Дэпартамента земляробства прывялі да стварэння (што праўда, не без супраціву з боку некаторых структурных аддзяленняў) у 1912 г. сельскагаспадарчай Рады – органа, які аб'ядноўваў і каардынаваў дзейнасць асобных сельскагаспадарчых арганізацый. Нажаль, усе памкненні ў гэтым кірунку не прынеслі вынікаў, на якія яны былі разлічаны. Распачаўшаяся ў 1914 г. Сусветная вайна зруйнавала ўсе намаганні па паляпшэнні аграрнай сферы Гарадзеншчыны пач. XX ст.

**КРЫНІЦЫ**


1. Jurkowski R. Ziemiaństwo polskie Kresów Pólnocno-Wschodnich 1864-1904. Warszawa, 2001.
2. Аб спробах адкрыцця сельскагаспадарчых навучальных устаноў у Гродзенскай губ. у XIX - пач. XX ст. / А. Р. Радзюк, В. В. Галубовіч // Современные технологии сельскохозяйственного производства: материалы 18-й междунар. науч.-практ. конф. / ГГАУ. – Гродно, 2015.
3. Деятельность научных обществ и губернских комитетов по развитию сельского хозяйства в дореволюционной Беларуси / В. Шарунов // Известия Национальной академии наук Беларуси. Серия аграрных наук. № 4, 2003. – С. 76.
4. З гісторыі садаводства на Гарадзеншчыне на рубяжы XIX-XX ст. / А. Р. Радзюк, В. В. Галубовіч // Современные технологии сельскохозяйственного производства: материалы 19-й междунар. науч.-практ. конф. / ГГАУ. – Гродно, 2016.
5. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1, спр. 607.
6. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1, спр. 923.
7. НГАБ у Гродне. Ф. 361, воп. 1, спр. 26.
8. Э. Ажэшка і спробы адкрыцця сельскагаспадарчай школы ў Гнойніцы / А. Р. Радзюк, В. В. Галубовіч // Современные технологии сельскохозяйственного производства: материалы 17-й междунар. науч.-практ. конф. Гродно, 2014. С. 299-302.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ